# ВІЦЕБШЧЫНА-2026.

# ВЫБІТНАЯ І НЕЗНАЁМАЯ. 03.07.2026-05.07.2026.

## Маршрут па Віцебшчыне (3 дні, 2 начлегі) , каля 940 км.

Легендарны **край блакітных азёр**, старажытных гарадоў і старадаўніх помнікаў, які даў свету такія імёны, як **Ефрасіння Полацкая**, **Францыск Скарына**, **Марк Шагал**, **Жарэс Алфёраў**, **Іван Чэрскі**, Леў Выгоцкі… Менавіта на віцебскай зямлі сусветна вядомы авангардыст **Казімір Малевіч** напісаў галоўную працу аб супрэматызме, а таленавіты жывапісец **Ільля Рэпін** стварыў амаль 40 карцін і малюнкаў. Унікальныя прыродныя жамчужыны **Віцебшчыны – нацыянальны парк "Браслаўскія азёры"**, які славіцца сотнямі маляўнічых азёр і астравоў, **ландшафтны заказнік "Ельня"**, дзе знаходзіцца адзін з самых вялікіх у Еўропе масіваў старадаўніх вярховых балот і ледавіковых азёр.

## ЦІКАВА і ВЕСЕЛА ! ЕДЗЕМ З НАМІ !



## Мінск - Талачын - Коханава - Манастыр - Друцк - Юрцава - Дуброўна - Орша

## Першы дзень. ПЯТНІЦА. 03.07.2026

## Мінск – Талачын – Коханава – Манастыр – Друцк - Юрцава - Дуброўна - Орша (345) км

1. **Збор і ад’езд а 10:00 ад АЗС1, пр.Незалежнасці,152 г.Мінск**( увага:! бліжыйшая запраўка ад Мінска ля Талачына, таму бакі ва ўсіх павінны быць поўнымі!!!).

2. **12:00. Праз 170 км.- Талачын!**

Талачын - гэта горад у Віцебскай вобласці Беларусі, адміністрацыйны цэнтр Талачынскага раёна. Асноўнай славутасцю горада Талачын з'яўляецца дзеючы Пакроўскі жаночы праваслаўны манастыр. У склад архітэктурнага ансамбля манастыра ўваходзіць Пакроўская царква, пабудаваная ў 1796 годзе, і размешчаны побач з царквой манастырскі корпус, пабудаваны ў 1779 годзе. Архітэктурны ансамбль манастыра ў горадзе Талачын уваходзіць у дзесятку самых прыгожых храмаў Беларусі ў стыле барока, з'яўляецца важным архітэктурным помнікам 18-га стагоддзя, гісторыка-культурнай каштоўнасцю і цікавай славутасцю Беларусі.







У горадзе Талачын маецца касцёл Святога Антонія, пабудаваны тут у 1853 годзе. Касцёл гэты не вельмі вялікі, але прыгожа размешчаны на пагорку. Касцёл у горадзе Талачын таксама з'яўляецца архітэктурным помнікам 19-га стагоддзя і гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Да іншых славутасцяў горада Талачын можна аднесці некалькі жылых, адміністрацыйных і прамысловых будынкаў 19-га - пачатку 20-га стагоддзяў.




.




1433




## 3. 13:00. 12 км. Коханава. Чыгуначная станцыя. Вежа вадацяжная.

У Талачынскім раёне, ля станцыі Коханава, захавалася рэдкая гіпербалоідная воданапорная вежа працы інжынера Уладзіміра Шухава (1929 г.). Яе ажурная канструкцыя з прамых бэлек нагадвае плецёны кошык: лёгкая, але неверагодна трывалая. Вежа дзесяцігоддзямі забяспечвала вадой паравозы і заставалася ў страі амаль да канца ХХ стагоддзя. Сёння гэта помнік прамысловай архітэктуры сусветнага ўзроўню - у Беларусі захавалася толькі дзве падобныя вежы (другая - у Барысаве). З 2019 года аб'ект мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.





## 4. 13:40. 18 км. Манастыр. Свята-траецкая царква.

У Талочынскім раёне ёсць мястэчка з прыгожай назвай Манастыр. Тут захавалася да нашага часу Траецкая царква. Храм пабудаваны ў 19 стагоддзя з цэглы. Будынак узводзіўся па тыпавому праекту ў псеўда - рускім стылі. За савецкім часам царква была зачынена і на палову зруйнавана. У апошнія гады храм быў адрэстаўраваны. З Талачына вядзе ў мястэчка добрая асфальтавая дарога. Царква парацуе.





# 5. 14:20. 21 км. Друцк. Замчышча. Горад -легенда.

Дручаск летапісны вядомы з пачатку XI стагоддзя (1078 год), а Друцкае Евангеле адсылае нас нават да 1001 года у сувязі з будаўніцтвам царквы. Друцкае княства праз тры стагоддзі ўвайшло ў склад ВКЛ і праіснаваў да XVII стагоддзя як цэнтр княства з сотняю храмаў і крэпасцю – замкам. Парушаны ў часы вайны з Масковіяй. Друцк-цэнтр рабагандлю на былых наўшых землях, спачатку адбудаваны Рагвалодам як форт, «Из варяг в греки», адкуль паслы Візантыі скупалі лепшых жанчын ( адсюль прымаўка-пракляцце жанчынам: Каб цябе жаніх у Друцку дачакаўся”и вынослівых рабоў…. Багацейшы горад таго часу, дзе срэбра цякло ракою, неаднойчы быў прадметам войн і напад з бакоў Кіева і Чарнігава, а ў 1106 годзе пры князе Глебе Менскім у рабства адразу ўсе жыхары гарадоў Слуцка і Ізбора…







## 6. 14:50. 17 км. ЮРЦАВА. ПАЛАЦА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ.



Сядзіба Любамірскіх — помнік сядзібна-паркавай архітэктуры гістарызму. Размешчаны на ўсходняй ускраіне в. Юрцава Аршанскага раёна, на правым беразе р. Скунья.

Сфарміраваны ў другой палове XIX стагоддзя ў фальварку Кацішын, які належаў К. Любамірскаму, пазней Я. Грабоўскаму.
Доўгі час у сядзібе змяшчаўся Рэспубліканскі шпіталь інвалідаў Другой сусветнай вайны.

Уяўляў сабой вялікі архітэктарскі ансамбль інтэрпрэтаваных формаў сярэдневяковага палацава-замкавай архітэктуры. Галоўны фасад сіметрычнай дзевяцівосевай кампазіцыі фланкіраваны глыбокімі рызалітамі з буйнымі кутнімі пілонамі і вылучаны ў цэнтры ганкам. З панадворку фланкіраваны моцнымі васьміграннымі вежамі, якія былі завершаны зубчастымі парапетамі. Берагавы нахіл мясцовасці раскрывае цокальны паверх, члянёны аконнай аркатурай, першы паверх з арачнымі вокнамі ў гатычных стральчатых нішах, другі — з прамавугольнымі вокнамі ў арачных нішах з клінападобнымі перамычкамі. Плоскасныя фасады будынку апяразаныя прафіляваным карнізам з аркатурным фрызам — адзіным элементам архітэктарскага дэкору. Планіроўка калідорная са скляпеністымі перакрыццямі памяшканняў цокальнага паверху. На кожным паверсе вуглавых вежаў размешчаныя круглыя ў плане залы.

## 7. 15:30. 12 км. ДУБРОЎНА.

Горад **Дуброўна** заснаваны ў 1393 годзе.Размешчаны на рацэ Дняпро пры ўпадзенні ў яго рэк Дубровенка і Свінка.

Паводле археалагічных даследаванняў, паселішча было заснавана ў XIIст. Упершыню ў пісьмовых крыніцах пад 1393 г. згадваецца як «зямля пустая Дубровенская». У пачатку XVст. мястэчка Дуброўна было цэнтрам буйной воласці на пагранічны Віцебскага і Смаленскага ваяводстваў. Яно ахоплівала амаль усю тэрыторыю цяперашняга Дубровенскага раёна і частку Смаленскай вобласці. Менавіта ў гэты час Дуброўна з воласцю вялікі князь літоўскі Аляксандр падараваў смаленскаму ваяводзе Юрыю Глябовічу. У час вайны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ 1512–1522 гг. Дуброўна занялі рускія войскі. Паводле мірнага пагаднення 1522 г. яно засталося ў складзе ВКЛ. У 1630 г. тут заснаваны касцёл і кляштар бернардзінцаў. У 1670-я гг. у Дуброўне было 15 вуліц і 2 завулкі, больш за 130 сядзіб. Існавала царква Спаса. Цэнтрам горада была прамавугольная гандлёвая плошча, забудаваная крамамі і каморамі. З 1690 г. Дуброўнам валодалі Сапегі. З 1715 г. – рускі князь А. Д. Меншыкаў. У 1719 г. К. Сапега адсудзіў горад у сваю ўласнасць. У 1750 г. тут была заснавана суконная мануфактура. У 1774 г. А. Сапега прадаў Дуброўна князю Р. А. Пацёмкіну. Бернардзінскі кляштар закрылі, а сюды перавялі кляштар піяраў.

Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. Дуброўна знаходзілася як павятовы горад у складзе Аршанскай правінцыі Расійскай імперыі. У 1777 г. яно ўвайшло ў Аршанскі павет Магілёўскага намесніцтва. Тут дзейнічалі 3 праваслаўныя царквы, сінагога, паштовы дом, штогод праходзілі кірмашы. У 1780 г. Дуброўна наведала імператрыца Кацярына II. З 1783 г. Дуброўнам валодаў князь Ф. К. Любамірскі. У 1784 г. у Дуброўне пабудавана першая ў Расійскай імперыі гадзіннікавая фабрыка. У 1785 г. пры кляштары піяраў быў адкрыты калегіум.

Пад час вайны 1812 г., у ліпені Дуброўна занялі французскія войскі. У пачатку лістапада праз мястэчка праехаў імператар Напалеон пасля бегства з Масквы.

У 1973 г. і 1985 г. складзены генеральныя планы Дуброўна. У горадзе захавалася планіровачная структура XVII–XVIIIстст. На месцы старога цэнтра сфарміраваны новы адміністрацыйны і грамадскі цэнтр.

У цэнтры Дуброўна і за 100 м на ўсход ад упадзення ракі Дубровенка ўДняпро захаваліся 2 гарадзішчы, якія з'яўляюцца помнікамі археалогіі. Захаваліся помнікі архітэктуры: кляштар бернардзінцаў XVIIст., Свята-Троіцкая царква 1-й паловы XIXст.

Дуброўна са старажытнасці вядома вырабамі мясцовых майстроў керамікі. Найбольшага развіцця гэта рамяство дасягнула ў 2-й палове XIX–пачатку XXстст.




Манастыр бернардынцаў. Барока.

У 15 – пачатку 16 стагоддзяў уладальнікам земляў у сучасным мястэчку Дуброўна быў адзін з найбагацейшых родаў – род Глебавічаў. Дзякуючы яму, тут узнік Дубровенскі замак, які з'яўляўся цэнтрам тагачаснай абароны. Глебавічы запрасілі на гэтыя землі бернардынцаў – каталіцкі манаскі ордэн, члены якога ў 1453 годзе ўладкаваліся ў Польшчы пры саборы святога Бернарда ў Кракаве. Бернардынцы славіліся сваёй лагоднасцю, адсутнасцю фанатычнай рэлігійнасці і займаліся рэлігійна-асветніцкай дзейнасцю. У 1630 годзе Мікалаем Глебавічам быў заснаваны Манастыр бернардынцаў. Аднак, пасля пажару, які адбыўся ў канцы 18 стагоддзя, уцалеў касцёл, які толькі знаходзіўся на тэрыторыі манастыра. На месцы згарэлага драўлянага манастыра, Ксаверый Любамірскі пабудаваў цагляны двухпавярховы Манастыр бернардынцаў у 1809 годзе.

## 8. 16:00. ОРША. 1067. ЛЕТАПІСНЫЯ АДНАГОДКі З МЕНСКАМ.
**Засяленне ў гасцініцу "ОРША" . Абед у кафэ "Рэста Бар №216".**

**Шпацыр:** **Во́рша** на Дняпры пры ўпадзенні ў яго ракі Аршыцы. Дзядзінец старажытнай Оршы (плошча 0,57 га) размяшчаецца каля сутокаў рэк Аршыцы і Дняпра, дзе археолагі выявілі паселішчы бронзавага і жалезнага вякоў.

Лічыцца, што ўпершыню Орша згадана ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 1067 годам як *Ръша*, каля якой 10 ліпеня схоплены полацкі князь Усяслаў, які пераплыў з сынамі на чаўне Дняпро для перамоў з кіеўскімі князямі і быў узяты ў палон.. Імаверна, горад пабудаваны ў 1101—1116 гадах менскім князем Глебам Усяславічам.

У першай палове XIV ст. у сувязі з прыгранічным размяшчэннем горада вялікім князем Альгердам вакол горада былі ўзведзены абарончыя ўмацаванні, а ў 1398—1407 гадах ужо па загадзе Вітаўта на месцы гарадзішча быў пабудаваны мураваны замак, а Аршанская харугва брала ўдзел у Грунвальдскай бітве (15.7.1410).

У першай палове XVI ст. Орша неаднаразова была занята маскоўскімі войскамі. У час вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім Княствам Літоўскім (1512—1522) непадалёк ад Оршы 8 верасня 1514 года адбылася адна з найбуйнейшых бітваў пачатку XVI ст. на тэрыторыі Еўропы, у выніку якой абаронцы Вялікага Княства Літоўскага перамаглі колькасна большае войска маскоўскіх захопнікаў.

У 1555 годзе вядомы палітычны і рэлігійны дзеяч Мікалай Радзівіл «Чорны» заснаваў у Оршы першы на тэрыторыі сучаснай Беларусі пратэстанцкі кальвінскі збор

23 лістапада 1593 года кароль і вялікі князь Жыгімонт Ваза надаў Оршы грамату аб гарадскім органе самакіравання, а 13 снежня 1620 года горад атрымаў Магдэбургскае права, пячатку і герб «*у блакітным полі залаты паўмесяц, паміж рагамі якога сярэбраны крыж*»

**У вайну Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай (1654—1667) маскоўскае войска зруйнавала Оршу.**

Кляштары заснаваны: (1636), дамініканцаў (1649), францысканцаў (1680), базыльянак, у XVIII стагоддзі — трынітарыяў (1714), Пакроўскі базыльянскі манастыр (1758, 1774). Дзейнічалі кляштары місіянераў (1752), марыявітак (18 ст.), цэрквы Ушэсця (1757), Іаана Багаслова (1790) і інш[11].

**З 1740 года езуіцкі калегіум атрымаў статус вышэйшай навучальнай установы. Тут выкладалі філасофію, граматыку, паэтыку, рыторыку, логіку. Пры калегіуме працавала музычная бурса і школьны тэатр. Аршанскі калегіум езуітаў дзейнічаў да 1820 года.**

У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе Орша ўвайшла ў склад Расійскай імперыі, дзе з'яўлялася цэнтрам Аршанскай правінцыі да 1775 года. У 1776 годзе расійскія ўлады пазбавілі горад Магдэбургскага права

У час вайны 1812 года французы занялі Оршу і пры адступленні парушылі большасць забудовы. **Гарадскім інтэндантам у час французскага панавання быў Анры Бейль, пазней ужо вядомы як французскі пісьменнік Стэндаль.**

**У часы Вялікай Айчыннай вайны, 14 ліпеня 1941 года савецкая армія ўжыла каля Оршы новую зброю — установку залпавага агню «Кацюша».**

У 1950—1970-я гады савецкія ўлады знішчылі царкву Пакрова Багародзіцы і манастыр базыльян, царкву Раства Багародзіцы, францысканскі касцёл Святога Антонія, Куцеінскі манастыр Прачыстай Багародзіцы, іншыя помнікі сакральнай архітэктуры, амаль цалкам зруйнавалі гістарычную забудову XVII—XX стагоддзяў. На месцы старажытнага горада паўстала пустэча.



Гарадзішча.



Былы езуіцкі калегіўм. XVII ст. Барока.





Касцёл Святога Юзэфа.1780. Вадзяны млын. 1902. Франтон кляштара.



Богаяўленскі манастыр з царквою.



Базіліанскі кляштар.



Кляштар трынітрыятаў. 1714 год.



Свята-Ільінская царква. 1897 год.




Чыгуначны вакзал. 1898 год.

**9. 20:00. Вячэра і танцы ў стыле “Дыска” - Кафэ “Рэста Бар №216”.**
**10.Шпацыр па начному гораду.**

## ДЗЕНЬ ДРУГІ. СУБОТА. 04.07.2026.

## Орша- Селішча-Высокае Арэхаўна- Віцебск (каля 110 км.).

**11.09:00. Сняданак.**
**12.10:00. Музей Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча.**

**КОЖНЫ ЧАЛАВЕК НОСІЦЬ СВАЁ НЕБА З САБОЙ.**

(У.С. Караткевіч)



Музей У.С.Караткевіча



**974ВОРША – ГОРАД, ЯКІ МЫ ПАЛЮБІЛІ.**

## 13. 12 км. 12:00. СЕЛІШЧА. КАСЦЁЛ СВЯТОЙ ВЕРАНІКІ І КЛЯШТАР БЕРНАРДЗІНЦАЎ.

Пабудаваны на беразе возера Янова ў 1726 годзе фундацыяй ротмістра полацкага Яна Язэпа Рагозы, полацкага падсудка Езафата Антонія Сялявы і яго жонкі Элеаноры з Коцелаў для ксяндзоў-бернардзінцаў. Кляштар скасаваны ў 1832 годзе, а храм часткова перабудаваны ў сярэдзіне XIX ст. З закрыццём у 1867 годзе большасці касцёлаў іх начынне перанесена ў касцёл Святой Веранікі.




2025 1941.




Графічная рэканструкцыя.

## 14. 9 км. 12:40. ВЫСОКАЕ. Сьвята-Ільлінская царква.

Помнік архітэктуры першай паловы XIX ст. Да 1839 году парафія Беларускай грэка-каталіцкай царквы . На загад Архіяпіскапа Полацкага і Віцебскага Васіля Лужынскага уласьнік маёнтка «Межаўскі ключ» Канстанцін Любамірскі фундаваў пабудову цаглянай царквы рэтраспэктыўна-расейскага стылю



## 15. 13 км. 13:20. АРЭХАЎНА.

 

**1819.Свята-Праскевіцкая Царква. Заснавана Ю.Грабніцкім. Сядзіба.**

## 16. 68 км. 14:20. ВІЦЕБСК. 974 ГОД. ЗАСНАВАНЫ КНЯГІНЕЙ ВОЛЬГАЙ.

**Засяленне ў гасцініцу «Віцебск». Абед у рэстаране «Віцебск».**

## 17. 16:00. ШПАЦЫР ПА ВІЦЕБСКУ.

**«Віцебск – другі ПАРЫЖ…, але ж больш лагодны» (Марк Шагал)**

Згодна з легендай, горад ля берагоў **Заходняй Дзвіны** і **Віцьбы** заснавала ў 947 годзе **княгіня Вольга**. Праз стагоддзі яму наканавана было стаць сусветнай скарбніцай талентаў: у Віцебску жылі і тварылі выдатныя мастакі **Марк Шагал**, **Казімір Малевіч**, **Восіп Цадкін**, **Іван Пуні**, філосафы **Мікалай Лоскі** і **Міхаіл Бахцін…**

**.Гэта горад на трох рэчках і пяці ландшафтных ярусах, куды едуць па дух старога брык-стайлу, утульнасць пешаходнай вуліцы і канцэрты ў невялікіх клубах, а некалі Віцебск абараняў усходнія межы Полацкага княства, Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Тут жылі**

**беларусы, латышы, палякі, габрэі і рускія. У сваім новым адраджэнні на пачатку XX стагоддзя горад узняў сцяг з профілямі Шагала і Малевіча на ім і ўзяўся ствараць новы брэнд: Віцебск – гэта, вядома, горад мастакоў.** Шмат хто з жыхароў горада лічыць, што пад ракой Заходняя Дзвіна існуе сістэма падземных праходаў, якія вядуць ад Успенскага сабору да супрацьлеглага берага Дзвіны. Пагалоскі пра гэта з'явіліся яшчэ ў 19 стагоддзі. Прычынай паслужыла гісторыя будаўніцтва Успенскага сабора ў 18 стагоддзі. Тады была пабудавана трывалая цагляна-драўляная дрэнажная сістэма, якая павінна была служыць для адводу грунтавых вод з падвалаў храма ў раку Дзвіну. Гавораць, што гэтыя водаадводы былі вышынёй з чалавека, каб можна было лёгка прайсці і прачысціць сістэму. Аднак у 19 стагоддзі ў царкоўных падвалах сабралася шмат вады...



Шпацыр пачынаецца з прагулкі на **плошчы Тысячагоддзя**- рэканструкцыя 1998 года **храма Дабравесця** – першага каменнага будынка ў Віцебску., якому больш за 900 гадоў.Кіруемся па прыгожым высокім беразе Дзвіны да тэатр імя Якуба Коласа, адкуль пачынаецца доўгая пешаходная зона. За мостам справа стаяў дом, дзе жыў пісьменнік Лазар Лагін, аўтар «Старога Хатабыча».
Высокая лесвіца вядзе наверх, да самага вялікага віцебскага храма – **Успенскага сабора** *(вул. Камісара Крылова, 9)*, але, не даходзячы да яе, лепей збочыць управа, на вуліцу Талстога, з яе забудовай канца XIX – пачатку XX стагоддзя. На месцы «Мікалаеўскага хутарка» раней быў **дом лекара Карла фон Гібенталя**.
На Ратушнай плошчы паглядзі на ўласна **Ратушу** з гадзіннікам *(вул. Леніна, 36)* – аўтэнтычны будынак XVIII стагоддзя.



Шыкоўны прыклад віленскага барока – **Васкрасенская царква** *(вул. Суворава, 2)*, адноўленая па ўзоры знішчанай у 1930-х.



Насупраць месціцца гонар кожнага віцьбіча – конны помнік вялікаму князю князю Альгерду.





Сын Гедыміна (1296-1377) Альгерд (радасць Ольгі), уладальнік Крэва, князь Віцебскі.

Гістарычная вуліца Узгорская зараз носіць назву Суворава. Рагавы будынак №3, які лёгка пазнаць па шпілі «з булавой», абвешаны мемарыяльнымі шыльдамі. Тут раней знаходзіўся Віцебскі мастацкі тэхнікум. Да Другой сусветнай вайны ў ім атрымліваў мастацкую адукацыю Васіль Быкаў. Будучы пісьменнік спачатку вучыўся на жывапісным аддзяленні, а потым яго і некаторых ягоных аднакурснікаў перавялі загадам дырэктара на скульптурнае. Майстэрні размяшчаліся ў падвале, іх вокны і цяпер можна разглядзець. Памятная шыльда Васілю Быкаву – крайняя справа.
Каля трэцяга дома па вуліцы Крылова выявіш цікавы арт-аб'ект **«Сідзейка»** – інтэрактыўная лаўка аўтарства віцебскага музыканта і кампазітара Яўгена Палавінскага. Сядзенне і спінка лавы падзеленыя на 256 дэталяў, іх можна круціць незалежна адно ад аднаго.
Вуліца Крылова заканчваецца рэканструкцыяй велічнага Успенскага сабора. На момант далучэння Віцебска да Расійскай імперыі тут не было праваслаўных храмаў. Новым адміністратарам не было дзе маліцца, таму самы вялікі з уніяцкіх сабораў хуценька адпісалі новым гасцям. Храм узарвалі ў 1936-м, аднавілі ў 2000-х. А вось былы **базыльянскі манастыр** за храмам *(вул. Путна, 2)* – аўтэнтычная пабудова XVIII стагоддзя. Дарэчы, 5 лютага 1898 года ў ім адбыўся першы на беларускіх землях кінасеанс.



Далей кароценькая гісторыя аб базыльянах віцебскіх ...

Манахі ордэна св. Базыля Вялікага з'явіліся ў Віцебску ў 1682 г. Яны размясціліся ў новым драўляным кляштары, які разам з царквою на ўласныя сродкі ўзвёў віцебскі земскі пісар Адам Францішак Кісель. Кляштар знаходзіўся на тэрыторыі Узгорскага замка, на высокай Прачысценскай (Лысай) гары, ля падножжа якой зліваліся рэкі Дзвіна і Віцьба.
На пачатку XVII ст. драўляная саборная царква на Прачысценскай гары стала уніяцкай, побач з ею было ўладкавана падвор'е Полацкага архіепіскапа
Замацавацца ў Віцебску базыльянам дапамог Полацкі уніяцкі архіепіскап Кіпрыян Жахоўскі, які ў 1682 г. падараваў манахам землі і лугі ў горадзе і ваколіцах, Крыху пазней, у 1697 г., пры царкве св. Духа ў Віцебску быў заснаваны жаночы базыльянскі кляштар, які разрабавалі маскавіты.
К сярэдзіне XVIII ст. Віцебскі базыльянскі кляштар меў досыць трывалае эканамічнае становішча. Згодна акту рэвізіі грашовых сум, праведзенай у кляштары ў чэрвені 1745 г. па загаду правінцыяла Свята-Троіцкай правінцыі базыльянскага ордэна, агульны даход віцебскіх

базыльян складаў 27237 фларынаў 14 грошаў, выдатак – 23012 фларынаў.

У 1742 г. віцебскія купцы бурмістры браты Міхаіл і Сямён Лапы ахвяравалі 6000 талераў бітых на пабудову мураванага храма ў гонар св. Язафата. Услед за Лапамі з той жа нагоды віцебскія бурмістры Іван Ігольнікаў і Мацвей Галуза з жонкаю ахвяравалі 2000 талераў бітых.

**Мураваны храм віцебскія базыльяне пачалі ўзводзіць у 1743 г, але былі вымушаны прыпыніць будаўнічыя працы і зрабіць на гары добрую дрэнажную сістэму**: структура глебы Прачысценскай гары аказалася такой, што траншэі, выкапаныя для закладкі падмуркаў, увесь час напаўняліся вадой. Па падземных вадасцёках вада збіралася ў драўляныя і мураваныя трубы, па якіх адводзілася ў рэкі Дзвіну і Віцьбу. Мураваныя трубы былі зроблены такога вялікага дыяметру, што па іх мог прайсці чалавек і пры неабходнасці прачысціць. Апошняя акалічнасць паспрыяла шырокаму распаўсюджванню ў наступным XIX ст. чутак сярод жыхароў горада аб наяўнасці падземнага хода пад Дзвіной, які быццам бы пачынаўся пад саборам на Прачысценскай гары.

Сутарэнні і сцены свайго храма базыльяне пачалі ўзводзіць толькі ў 1745-46 гг. Разам з новай царквой узводзіліся і мураваныя кляштарныя будынкі. У галоўным трохпавярховым корпусе размяшчаліся манаскія келлі і школа для дзяцей шляхты (зараз тут знаходзіцца станкаінструментальны тэхнікум). Гэта было манументальнае збудаванне з доўгім, прарэзаным прамавугольнымі вокнамі і раскрапаваным сціплымі плоскімі пілястрамі фасадам, які быў звернуты да адкрытага краявіду (рэчышча Дзвіны). З боку двара да яго перпендыкулярна далучалася двухпавярховае крыло, у якім на першым паверсе знаходзілася трапезная, а на другім – бібліятэка. Увесь корпус быў накрыты высокім ламаным дахам, а яго бакавыя фасады мелі ў завяршэнні высокія трохчасткавыя барочныя франтоны.

Тым часам у 1772 г. у выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай горад увайшоў у склад Расейскай імперыі. Спачатку новая ўлада, яшчэ талерантна ставілася да прадстаўнікоў розных канфесій на нованабытых землях. У асобе віцебскага губернатара генерала Крачэтнікава Масква начала аказваць базыльянам "сваё садзейнічанне да хутчэйшага заканчэння храма." Справа будаўніцтва, нарэшце, зрушылася з месца. Да таго ж, у 1775 г. Віцебскі кляштар атрымаў грашовую падтрымку ў суме 20000 польскіх злотых, ад базыльян з Берасця.
**Кляштарны комплекс, узведзены базыльянамі на стромым адхоне Прачысценскай гары, адразу стаў адметнасцю горада. Царква базыльянскага кляштара была самым вялікім па памерах храмам Віцебска. Адначасова яна ўяулялася і самым высокім храмам (вышынёй каля 45 метраў), да таго ж была размешчана на другой па вышыні пасля Замкавай Прачысценскай гары.**

Віцебскі базыльянскі кляштар на працягу двух стагоддзяў адыгрываў істотную ролю не толькі ў рэлігійным, але і ў грамадскім жыцці горада. **Пры кляштары дзейнічала філасофская студыя для манахаў, а таксама школа для свецкага юнацтва, у якой навучалася больш за 100 вучняў.**

**Пасля скасавання Кацярынай II самакіравання беларускіх гарадоў, у кляштарны архіў трапілі дакументы архіва віцебскага магістрата: каралеўская грамата 1641 г. на аднаўленне магдэбургскага права ў Віцебску, права віцебскага магістрата 1681 г. на пляц і крамы пад ратушай і інш.**

**Як вядома, на момант уваходжання Віцебска ў склад Расейскай імперыі ў горадзе не было ніводнай праваслаўнай царквы**. Адміністратыўны цэнтр Віцебска размяшчаўся на левабярэжжы, падчас веснавой паводкі, якая зносіла ўсе масты, сувязь паміж дзвюма часткамі горада практычна перапынялася. У такіх абставінах Велікоднае свята віцебскаму губернатару, віцэ-губернатару, каменданту і ўсяму расейскаму гарадскому чыноўніцтву даводзілася адзначаць у царкве базыльянскага кляштара. Канечне, такі стан рэчаў доўга працягвацца не мог. Імперскія ўлады пачалі клапаціцца аб адкрыцці ў вялікіх гарадах на далучаных тэрыторыях праваслаўных саборных цэркваў. У Віцебску гэтая справа асабліва цікавіла святара Мікалаеўскай батальённай царквы айца Іаана Сырахнова.

Па-першае, каб пахіснуць пазіцыі манахаў-базыльян у горадзе, ён данёс вышэйшым уладам

аб тым, што 19 чэрвеня 1795 г. у сваей царкве базыльяне чыталі не рэскрыпт імператрыцы Кацярыны II аб безперашкодным далучэнні да праваслаўя ўсіх вернікаў-уніятаў, а малітву аб пакарэнні "ўсіх цэркваў і людзей свяцейшаму ўсяленскаму вялікаму архірэю Пію, папе рымскаму." На падставе гэтага данясення супраць базыльян была ўзбуджана крымінальная справа. Спецыяльным рэскрыптам Паўла I ад 18 ліпеня 1799 г. царква Віцебскага базыльянскага кляштара была перададзена ў праваслаўнае ведамства Беларускага епіскапа Анастасія, а памяшканні кляштара – у падпарадкаванне губернскага начальства.

**Пасля выдалення манахаў-базыльян з Віцебска ў колішніх кляштарных будынках размясціліся губернскае праўленне і казённая палата. Пасля перадачы ў праваслаўнае ведамства былая царква базыльянскага кляштара перацярпела некалькі перабудоў. Першая з іх прыпадае на 1804 г., пасля чаго аблічча храма набыло рысы класіцызму. У наступныя гады быў знішчаны высокі барочны дах над кляштарнымі будынкамі і элементы дробнай пластыкі ўсяго комплексу. З канца 1850-х гадоў у былых базыльянскіх мурах размясцілася праваслаўная духоўная семінарыя, пераведзеная з Полацка ў Віцебск.**

У 1991 г. прадпрыемства "Віцебскпраектрэстаўрацыя" выканала комплекс археалагічных і гісторыка-архіўных прац па вывучэнню былой царквы базыльянскага кляштара. Архітэктарам Ігарам Роцькам былі зроблены дзве рэканструкцыі храма – на канец XVIII і сярэдзіну XIX стст. Нажаль, як і ў выпадку з Рынкавай царквой царкоўныя ўлады выбралі апошні па часе варыянт, які адпавядае праваслаўным канонам, але страчвае барочнаму арыгіналу XVIII ст. у сваёй прыгажосці. Але ж…



Алея вуліцы Путна прывядзе ў сквер 1812 года. Тут самае цікавае – **будынак былой дваранскай сядзібы і палаца губернатараў** *(вул. Савецкая, 18)* у стылі класіцызму. Французскі імператар Напалеон правёў у ім два тыдні: прывітаў парад з балкона, адсвяткаваў свой дзень нараджэння і прыняў найгоршае ў жыцці рашэнне – ісці на Маскву.

У цэнтры парка – манумент у памяць пра бітву пад Віцебскам летам 1812 года. Гранітная стэла пашкоджаная, але не вандаламі, а бамбардзіроўкамі Другой сусветнай.

У Задзвінні можна паглядзець **саляныя склады XVIII стагоддзя** *(вул. Чайкоўскага, 3)*, прыжыццёвы помнік беларускаму і польскаму касманаўтам Пятру Клімуку і Міраславу Гермашэўскаму *(у скверы насупраць вул. Дзімітрава, 32)*, былыя габрэйскія кварталы з чырвонымі стогадовымі будынкамі: вуліцы Красіна, Рэвалюцыйная, Пакроўская, Савецкай арміі. На скрыжаванні апошніх трох – помнік віцебскаму мастаку №1 Марку Шагалу.

Непадалёк стаіць **віцебскі піўзавод** *(вул. Ільінскага, 25а)*, пра які яшчэ Маякоўскі гаварыў, там жа разліваюць свежае піва на вынас. Аматарам неаготыкі варта дабрацца да **касцёла Святой Барбары** *(вул. Ленінградская, 27)*. Абыдзі яго вакол, каб адчуць сапраўдны прафесіяналізм рэстаўрацыі пачатку 1990-х. Камяні ў падмурку храма – надмагіллі са знішчаных каталіцкіх магілак.




Першапачаткова касцёл быў пабудаваны напрыканцы XVIII ст. на каталіцкіх могілках, якія ў той час былі за горадам, на Гарадоцкай шашы. Яго так і называлі – Падвіцебскі. У 1785 го-дзе ён быў асвечаны ў гонар святой пакутніцы Барбары.

Пасля пабудовы чыгункі ў гэтым раёне сталі ўзводзіць хаты яе работнікі, многія з якіх былі каталікамі. Касцёл ужо не змяшчаў усіх вернікаў. Таму ў 1880-х было прынята рашэнне аб пабудове новай бажніцы. Яе зрабілі з чырвонай неатынкаванай цэглы па праекце інжынера-архітэктара Віктара Піятроўскага. Храм пабудаваны ў эклектычным стылі, гэта сумяшчэнне неаготыкі і неараманскага кірунку, хаця папярэднік быў цалкам барочны.

У паслярэвалюцыйныя часы касцёл зачынілі, а потым выкарыстоўвалі ў якасці склада мінеральных тукаў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны будынку, можна сказаць, пашчасціла: абстрэлы толькі часткова пашкодзілі яго вежы, хаця навокал былі спрэс руіны. Пасля вайны касцёл пакрысе прыйшоў у заняпад. Яго нават выкарыстоўвалі ў трэніровачных мэтах альпіністы як плацдарм для пераадольвання вяршынь.

Былі знішчаны і старажытныя могілкі: на іх месцы пабудавана прадпрыемства. Да гэтага часу пры пракладцы камунікацый знаходзяць

помнікі, якія ўсталёўваюцца на прыкасцёльнай тэрыторыі. Сёння каля ўваходу ў храм стаіць знак у памяць памерлых.




Асобны пункт для паломніцтва – віцебскі «Баухауз», былы будынак **Вышэйшай народнай мастацкай вучэльні,** заснаванай Шагалам, і майстэрняў **УНОВІС** *(вул.Шагала, 5а)*. У 1920-х тут сабраліся найлепшыя фігуры авангарду, у тым ліку Малевіч, Лісіцкаг і Ермалаева. Цяпер гэта сучасны музей з аднаўленымі па фота кабінетамі Шагала і Малевіча, майстэрні Лісіцкага і плакатам «Клінам чырвоным бі белых», выкладзеным проста на гранітнай падлозе.

Маленькі **Дом-музей Марка Шагала** *(вул. Пакроўская, 11)* – гэта must see. Тут мастак правёў дзяцінства і юнацтва. Абавязкова бяры мясцовую экскурсію, гід там проста неймаверны! У **арт-цэнтры Марка Шагала** *(вул. Савецкая 25)*, які стаіць за Дзвіной, экспануюцца работы майстра і блізкія па духу.

У Ратушы размяшчаецца **Віцебскі абласны краязнаўчы музей** *(вул. Леніна, 36)* – тут сабраная гісторыя горада: археалогія, скарбы, прырода, вайна. На вежы – аглядная пляцоўка з цудоўным відам, адкрытая ў цёплы час года. **Мастацкі музей** (вул. Леніна, 32) – найлепшы ў горадзе для індывідуальнага наведвання, са зборам беларускага і рускага жывапісу, калекцыяй Пэна – першага настаўніка Шагала – і выставамі мэтраў віцебскай мастацкай школы.

**18. 20:00-21:00. ВЯЧЭРА Ў РЭСТАРАНЕ "ВІЦЕБСК".**

**19. 21:00-23:00. ВОЛЬНЫ ЧАС. (ШПАЦЫР ПА ВЯЧЭРНЯМУ ВІЦЕБСКУ. КЛУБ "РОК і ПАБ", БАР "САХА").**

**ДЗЕНЬ ТРЭЦІ. НЯДЗЕЛЯ. 05.07.2026.**

**20. 9:00-10:00. СНЯДАНАК у РЭСТАРАНЕ "ВІЦЕБСК"**

**21. 10:00-11:00. МУЗЕЙ МАРКА ШАГАЛА.**

**22. 11:00 – Развітанне з Віцебскам.**

**23. 25 км. 12:00 – Астроўна. Радзіма Сапегаў. Былы касцёл пачатку XVII ст.**



**Храм Святой Тройцы заснаваны ў 1564 годзе Міхалам Пацэем, а Аляксандр Сапега пабудаваў манастыр для манахаў дамініканскага ордэна ў 1622 годзе, у 1873 годзе храм быў перабудаваны ў праваслаўны.**

**24. 27 км. 12:40. Бешанковічы.**



**Палац Храптовічаў кан. 18 ст., царква 19 ст.,прыстань (пантонны мост, экспазіцыя якараў, прыстанскія цэйсгаўзы і сядзіба "Стары Марыяныльд".**

**25. 13 км. 13:30. Слабодка. Храм Святога Мікалая ля Чорнага возера.**





**26. 12 км. 14:00. Свяча. Царква Раства Багародзіцы. 1895 год. Гатычнасць, і класіка.**

**27. 15 км. 14:40. Іванск. Сядзіба Валадковічаў. Адна з лепшых у Еўропе канца XVIII ст. бібліятэк і калекцый унікальнага посуда. Іпадром і капліца.**

**28. 17 км. 15:10. Марцінава. Пакроўская царква. XIXст. Царква**

**Аляксандра Неўскага.**





**29. 12 км. 15:40. Бачэйкава. Палац Цеханавецкіх. Парк, флігель, памятны знак.**



**1917.**



**Сучаснасць.**

**30. 18 км. 16:20. Чашнікі. Царква 19 ст. Дом купца Гурэвіча 19 ст. Гістарычная забудова канца 19 ст.**



 

**31. 30 км. 17:00. Лепель ( Новы, Белы Лепель). 1439 год. Праменад па гістарычнай забудове канца 19 стагоддзя, касцёл 19 стагоддзя, знаёмства з Цмокам і амыванне хвалямі Лепельскага возера…**





**32. 150 км. 18:30-19:00. Мінск.**

**Запраўкі: АЗС “Беларуснафта”: 1) Талачын ( развязка); 2) Орша; 3) на ўездзе ў Віцебск; 4) на выездзе з Віцебску; 5) Бешанковічы (абвадная); 6) Лепель; 7) Бягомль.**

**Увага: прадстаўленая праграма , як заўжды, праграма-максімум, напружаная і цікавая, у якую магчыма ўнасіць змяненні па ходу вандроўкі.**

## ПАПЯРЭДНІ СКЛАД УДЗЕЛЬНІКАЎ МОТАВАНДРОЎКІ

**31 чалавек.**

**З ПАВАГАЙ МІХАІЛ ЖЫХ 10.06.2026г.**

**+3758296130993**

**Mij.ik54@gmail.com**